Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІСТАПАДА 2017 г. ПЯТНІЦА №222 (28586)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Божае слова па-беларуску

СТАР. 3



Дзённік з прыёмнага пакоя

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

■ 17 лістапада — Сусветны дзень студэнта

# Студэнт... Як шмат у гэтым гуку!

Беларусь лідзіруе сярод краін СНД па суадносінах колькасці студэнтаў і колькасці насельніцтва. Такія звесткі ўтрымліваюцца ў аглядзе да Сусветнага дня студэнта, які падрыхтаваў Нацыянальны статыстычны камітэт.

СТАР. 3



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:**

*«Органы ўнутраных спраў дастаткова эфектыўна вырашаюць задачы па абароне жыцця, здароўя, маёмасці грамадзян, уласнасці дзяржавы, у цэлым па падтрыманні высокага ўзроўню грамадскай бяспекі і парадку ў краіне. Стаўленне грамадзян да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў неабходна трансфармаваць, павялічваючы іх аўтарытэт у вачах грамадскасці. Выбудоўваць далейшы працэс узаемадзеяння з грамадзянскай супольнасцю прапануецца з дапамогай новага складу грамадскага савета пры МУС. Савету адводзіцца вялікая роля ў наладжванні гэтага дыялогу і падтрыманні яго ў канструктыўным рэчышчы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 2,0068 ▲ |
| Еўра | 2,3646 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0334 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0757 ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Турызм

## Колькі працягнецца «мёртвы» сезон?

Што стрымлівае развіццё турыстычна-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал»



**Турыстычны сезон на канале завяршыўся з надыходам восені. Такая сітуацыя доўжыцца цэлае дзесяцігоддзе. Вялікія планы па асваенні тэрыторыі так і засталіся на паперы. А час, між іншым, патрабуе новага падыходу: інтарэс да аб'екта ёсць не толькі ў беларусаў, але і ў замежных турыстаў, многія з якіх сёлета маглі без візы наведаць гэтыя мясціны.**

СТАР. 4

■ Акцэнт на здароўе

## НЕ ПАЧЫНАЙЦЕ! А ПАЧАЛІ — КІДАЙЦЕ!

Ёсць людзі, якім надзвычай цяжка адмовіцца ад тытуню, але гэта не азначае, што і спрабаваць не варта

**Жанчына з каляскай і цыгарэтай у руках — не такая ўжо рэдкасць. Падыдзі ты, скажы, каб яна падумала, што робіць... Пачуеш, што гэта яе «асабістая справа». На жаль, не асабістая. Шкода пасіўнага курэння даказана. У нашай краіне нямала і дзяцей, і дарослых, ды што там — свойскіх жывёл, якія пакутуюць з-за таго, што знаходзяцца побач з чалавекам, які разважае як гэта маладая мамачка. Пра жывёл — зусім не жарт. У ЗША з'явіліся нават ветэрынары-анколагі. Сабакі і каты, якія жывуць у сем'ях курцоў, урэшце пакутуюць ад анкалагічных захворванняў, а значыць, маюць патрэбу ў адпаведным лячэнні... У нас таксама пакутуюць. І гінуць.**

Чаму штогадовае правядзенне сённяшняга Міжнароднага дня адмовы ад тытуню ініцыюе Міжнароднае агенцтва па раку? А таму, што найбольшыя страты ад курэння звязаны з развіццём анкалагічных захворванняў.

— Людзі не жадаюць гэта чуць, бо рак — захворванне пажылых, тых, каму за шэсцьдзясят, а курэнне пачынаецца, калі табе 18—20 і ты разважаеш на ўзроўні «а ці ёсць жыццё пасля пяцідзесяці?» — адзначае **загадчык аддзела арганізацыі супрацьракавай барацьбы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, кандыдат медыцынскіх навук Павел МАІСЕЕЎ.** — Сацыяльная рэклама МНС «Курэнне ў ложку забівае» збівае з толку. Можна падумаць, што не ў ложку тытунь гэтага з намі не робіць. Сёння мы дасягнулі важкіх вынікаў — лечым той жа рак лёгкіх не горш, чым у ЗША (вынікі, па меншай меры, супастаўляльныя), але ж расслабляцца не варта.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Факт

# Выбары ў мясцовыя Саветы прызначаны на 18 лютага

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №410 «Аб прызначэнні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакумент накіраваны на рэалізацыю канстытуцыйных паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы па прызначэнні чарговых выбараў у мясцовыя прадстаўнічыя органы (пункт 2 артыкула 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь). Указам прадугледжваецца прызначэнне выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць восьмага склікання на 18 лютага 2018 года. Дзяржаўным органам і іншым арганізацыям даручаецца забяспечыць выкананне аднесеных да іх кампетэнцыі арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў. Урад у тым ліку павінен прафінансаваць выдаткі на выбарчую кампанію ў межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на гэтыя мэты ■

# Па справядлівасці

## У Палацы Незалежнасці абмеркавалі асобныя пытанні крэдытна-фінансавых арганізацый

**Прэзідэнт засяродзіў увагу на выніковасці работы банкаў, а таксама на зарплаце супрацоўнікаў гэтай сферы — асабліва кіраўнікоў і топ-менеджараў. Асноўны пасыл — зарплата там павінна адпавядаць таму ўзроўню аплаты працы, які склаўся ў краіне.**

### Інтарэсы эканомікі

— Хацелася б абмеркаваць пытанні эфектыўнасці кіравання ў крэдытна-фінансавых арганізацыях, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка напачатку. — Якая там сітуацыя? На гэты конт мы дамаўляліся і мной былі дадзены канкрэтныя даручэнні, у тым ліку прысутным тут службовым асобам. Хачу пачуць, якія канкрэтна меры прыняты. Наколькі прымяняемыя падыходы адпавядаюць задачам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны? Ці адпавядае дзеючая сістэма сучасным умовам і найлепшым сусветным практыкам?

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: сусветная практыка — гэта, перш за ўсё, сусветная практыка. У нас часта звяртаюць увагу на тое, што Беларусь — дзяржава, якая развіваецца, і пэўнага ўзроўню развіцця — у тым ліку крэдытна-фінансавых арганізацый — мы пакуль не дасягнулі. Узнікае заканамернае пытанне: навошта мы ў тым ліку заработную плату сабе налічваем паводле сусветных практык — у банкаўскай сферы?

— Паколькі мы на шляху да найлепшых сусветных практык, давайце адпавядаць гэтаму па ўсіх паказчыках, — лічыць кіраўнік дзяржавы, — у тым ліку матэрыяльнага забеспячэння саміх арганізацый і іх работнікаў. Маё патрабаванне вы ведаеце: дзейнасць усіх арганізацый, уключаючы банкі, павінна быць выніковай і максімальна ўлічваць інтарэсы нацыянальнай эканомікі.

### Зарплата — заробленая

Галоўнае пытанне, па якім учора ішла размова, — грашовае забеспячэнне (заработная плата, бонусы) работнікаў і кіраўнікоў банкаўскіх устаноў:

— Мяне перасцерагаюць ад шчырай на гэтую тэму размовы, што гэта, маўляў, не спадабаецца МВФ, можа, яшчэ нейкім міжнародным арганізацыям. Гэта меркаванне можаце пакінуць у сябе. Я пакуль Прэзідэнт Беларусі і не планую быць прэзідэнтам або кіраўніком міжнародных арганізацый, таму і вам таксама раю займацца пытаннямі Беларусі. І калі мы сёння кажам пра матэрыяльнае забеспячэнне работнікаў банкаў, вы павінны ведаць пра маю пазіцыю: чым багацейшыя людзі ў краіне, тым лепш для Прэзідэнта.

Але пакуль, на жаль, нашы даходы не такія і вялікія. Сёння ў нас, як канстатаваў кіраўнік дзяржавы, ніхто асабліва не панствуе.

— 500 долараў, або 1000 рублёў, пра якія мы казалі — з такой вялікай цяжкасцю ва ўрада і ў тым ліку Нацыянальнага банка з падкантрольнымі банкамі, так цяжка ідзе гэтае пытанне. Дык давайце будзем адпавядаць і ў банкаўскай сістэме гэтай праблеме. Гэта значыць, зарплата павінна быць заробленай — заўсёды банкіры пра гэта кажуць. І я іх у гэтым падтрымліваю: па ўсёй краіне дарэмнай платы быць не павінна.

Значыць, зрабіў вывад Аляксандр Лукашэнка, і ў банкаўскай сістэме зарплата павінна быць заробленай. Звярнуўся ён і да тэмы бонусаў (так, у сферы раздзяляюць зарплату і бонусы) — маўляў, яны зарплатай не лічацца. Кіраўнік дзяржавы з гэтым не згодны:

— А што, гэта не грошы? Можна выбудаваць такую сістэму, што ты будзеш капейкі атрымліваць на працягу месяца—года ў выглядзе зарплаты, а бонусамі можна падавіцца, як у народзе кажуць. Таму давайце глядзець у цэлым на тое, як гэта будзе выглядаць.

Прэзідэнт выказаў пажаданне, каб сярэдняя зарплата ў банкаўскай сферы была падобная да сярэдняй зарплаты па краіне:

— Каб банкаўская сістэма не была, цытую народ, «зборышчам тлустых катоў». Гэта кажуць не толькі рабочыя і сяляне, гэта кажа ўся інтэлігенцыя. Банкаўскія работнікі павінны адпавядаць таму ўзроўню, які склаўся ў краіне, — па заработнай плаце і даходах.

### У аснове будзе сістэмнасць

Аляксандр Лукашэнка, слухаючы даклад па тэме, даручыў распрацаваць выразную сістэму аплаты працы кіраўнікоў банкаў у краіне. Так, заработная плата топ-менеджараў асобных банкаў у нашай краіне вельмі высокая — нашмат большая, напрыклад, чым у членаў урада.

— Мы апошнім часам, правёўшы аптымізацыю, усю заработную плату для дзяржаўных служачых выбудавалі — ад прэм'ер-міністра да старшыні сельскага Савета. Усё дакладна і пэўна. Скарачаешся, з'яўляюцца вольныя грошы — забірай, размяркоўвай сярод тых, хто застаўся, — нагадаў схему Аляксандр Лукашэнка. — Вось у гэту сістэму павінна быць уманціравана і сістэма банкаўская, у тым ліку кіраўнікоў нашых банкаў. Як вы бачыце, я тут не падзяляю прыватныя банкі і дзяржаўныя. Ёсць старшыня Нацыянальнага банка, устаноўленае яму грашовае забеспячэнне — і пачынайце танцаваць ад старшыні Нацыянальнага банка. Гэта прыкладна тое ж самае, што ад прэм'ер-міністра. У іх прыкладна аднолькавая заработная плата.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што як эканаміста яго вучылі: заработная плата павінна адпавядаць якасці і аб'ёмам выкананых работ.

— Не думаю, што кіраўнік канкрэтнага прыватнага або дзяржбанка працуе больш і больш якасна, чым старшыня Нацыянальнага банка, — адзначыў ён. — Калі так, тады трэба Прэзідэнту задумацца. Але пакуль я бачу, што гэта не так, таму прывязаць заработную плату з бонусамі і іншым да старшыні Нацыянальнага банка — гэта цалкам нармальна.

Банкаўская сістэма, крэдытна-фінансавыя арганізацыі не павінны выступаць з агульнай сістэмы дзяржавы — асноўны пасыл учарашніх тэзісаў кіраўніка дзяржавы. Ён запатрабаваў ад урада і перш за ўсё ад Нацбанка распрацаваць дакладную сістэму аплаты працы кіраўнікоў банкаў. Яна, падкрэсліў Прэзідэнт, павінна быць справядлівай і працаваць па-чалавечы. Прэзідэнт папярэдзіў аб адказнасці за вынік і выкананне яго даручэнняў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Reuters: прэзідэнт Зімбабвэ адмаўляецца падаваць у адстаўку

Па даных агенцтва, Мугабэ настойвае на правядзенні выбараў лідара кіруючай партыі «Афрыканскі нацыянальны саюз Зімбабвэ — Патрыятычны фронт» (ЗАНУ-ПФ). Прэзідэнт заяўляе, што ён можа пакінуць пасаду, толькі калі прайграе выбары кіраўніка партыі.

Пасярэднікам на перагаворах паміж Мугабэ і ваеннымі, якія ўзялі пад кантроль сітуацыю ў краіне, выступае каталіцкі святар Фідэліс Муканоры. Мугабэ з'яўляецца католікам па веравызнанні.

Віцэ-прэзідэнт і былы шэф спецслужбаў Зімбабвэ Эмерсан Мнангагва на працягу апошняга года таемна вёў перагаворы з ваеннымі і апазіцыяй аб магчымай будучай палітычнай канфігурацыі ў краіне пасля адыходу ад улады Мугабэ. Пра гэта сведчаць дакументы зімбабвійскай разведкі, якія апынуліся ў распараджэнні агенцтва.

Між тым у сталіцу Зімбабвэ Хараре ўчора ўвечары вярнуўся лідар апазіцыі, кіраўнік партыі «Рух за дэмакратычныя перамены» Морган Тсвангіраі, які знаходзіўся за мяжой для лячэння раку. Яго прыбыццё ў Зімбабвэ падагравае здагадкі наконт таго, што ў краіне вядзецца падрыхтоўка да перыяду пасля адстаўкі Мугабэ, піша агенцтва.

### Удалося сфатаграфаваць гіганцкі айсберг, які адкалоўся ад Антарктыды

Падчас даследавання шэльфавага ледавіка Ларсена навукоўцы атрымалі пацвярджэнне інфармацыі аб вялізным кавалку лёду, які адкалоўся яшчэ ў ліпені ад Антарктыды. На думку спецыялістаў, ад ледавіка адкалоўся гіганцкі айсберг масай каля 1 трлн тон. Фотаздымкі зрабіў самалёт P-3 Orion, які пралятаў у гэтым рэгіёне. Калі меркаваць па фота, то плошча груды лёду складае 5800 кв. км. Гэта роўна па плошчы сямнаццаці такім гарадам, як Мінск, ці двум Люксембургам.

Вестка насцярожыла маракоў, паколькі таўшчыня айсберга складае 190 метраў, з якіх 30 ўзвышаюцца над вадой. Такая маса лёду з лёгкасцю адправіць на дно нават авіяносец. Вучоныя лічаць, што айсберг ужо ўвайшоў у гісторыю як самы буйны з калі-небудзь выяўленых.

### У ЗША прадалі самую дарагую карціну ў свеце



Карціна Леанарда да Вінчы «Збаўца свету» прададзеная на аўкцыёне Christie's у Нью-Ёрку за 400 мільёнаў долараў (выніковы кошт з падаткамі і зборамі складзе больш за 450 мільёнаў долараў). Гэта стала рэкордам для твораў, калі-небудзь прададзеных на аўкцыёнах, паведамляе карэспандэнт РІА Навіны.

Адзіная з вядомых карцін Леанарда да Вінчы, якая знаходзілася ў прыватнай калекцыі, стала галоўным лотам не толькі таргоў пасляваеннага і сучаснага мастацтва, але і ўсяго XXI стагоддзя. На таргі яна выстаўлялася за 100 мільёнаў долараў.

У барацьбу за карціну ўступілі пяць патэнцыйных пакупнікоў, аднак, калі стаўкі перайшлі мяжу ў 200 мільёнаў, іх засталося двое. Карціна ў выніку пайшла да пакупніка, які па выніках амаль паўгадзінных таргоў прапанаваў за палатно 400 мільёнаў долараў. Лічыцца, што карціна «Збаўца свету» (Salvator Mundi) была напісана майстрам каля 1500 года.

Гэтая сума ўдвая большая за рэкорд, устаноўлены таксама на таргах Christie's у Нью-Ёрку ў 2015 годзе. Апошнія паўтара года самай дарагой карцінай лічылася праца Пабла Пікаса «Алжырскія жанчыны», якую купіў былы прэм'ер-міністр Катара Хамад бен Джасем Аль Тані амаль за 200 мільёнаў долараў.


**Извещение о проведении аукциона на право заключения договора аренды охотничьих угодий**

Пинский районный исполнительный комитет (далее – райисполком) доводит до сведения заинтересованных юридических лиц о проведении аукциона на право заключения договора аренды охотничьих угодий общей площадью 31,2 тыс. га, из них лесных угодий – 20,8 тыс. га, полевых угодий – 9,2 тыс. га, водно-болотные – 1,2 тыс. га в следующих границах:

*северная граница:* от р. Вислица по границе Пинского и Ивацевичского районов до административной границы Ганцевичского района. Затем на восток по границе Пинского и Ганцевичского районов до восточного угла квартала №4 Бобриковского лесничества;

*восточная граница:* от восточного угла квартала №4 Бобриковского лесничества на юг по границе Пинского и Ганцевичского районов до квартала №33 Мало-Плотницкого лесничества далее на юг по границе Пинского и Лунинецкого районов до южного угла квартала №64 Мало-Плотницкого лесничества;

*южная граница:* от южного угла квартала №64 Мало-Плотницкого лесничества на юго-запад по границе Пинского и Лунинецкого районов до р. Бобрик. Затем на север по р. Бобрик до пересечения с Мало-Плотницким каналом. Далее по мелиоративному каналу-собирателю на запад по южной границе квартала №1, северной границе Доброславского лесничества и далее от квартала №78 Доброславского лесничества по проселочной дороге до н.п. Доброславка. От н.п. Доброславка на юго-запад по автодороге Ганцевичи-Логишин до моста через р. Вислица;

*западная граница:* от автодороги Ганцевичи-Логишин на север по р. Вислица до границы с Ивацевичским районом.

Начальная цена объекта торгов – 1 076,40 (одна тысяча семьдесят шесть рублей 40 копеек) белорусских рублей.

Аукцион состоится 22 декабря 2017 г. по адресу: г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, 21, малый зал райисполкома. Начало в 11.00. Организатор аукциона – Пинский райисполком.

Для участия в аукционе заинтересованным необходимо представить следующий пакет документов:

заявление о предоставлении охотничьих угодий, с их описанием которые участники торгов желают получить в аренду по результатам торгов;

биолого-экономическое обоснование на охотничьи угодья, разработанное с учетом требований законодательства;

доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов;

копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка.

Сумма задатка составляет 215, 28 (двести пятнадцать рублей 28 копеек) белорусских рублей, вносится в срок не позднее 20 декабря 2017 г. путем безналичного расчета платежным поручением на счет районного бюджета BY97BAPB36414711701110000000 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY21401 УНП 200079960, назначение платежа: за участие в аукционе.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, 21, 5-й этаж, каб. 64, телефон 8 (0165) 31 64 21.

Окончательный срок приема документов – 20 декабря 2017 г.

Участник, выигравший аукцион, в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает путем безналичного расчета платежным поручением затраты на организацию аукциона – сумму оплаты за публикацию в СМИ извещения о проведении аукциона.

Предварительное ознакомление с расположением охотничьих угодий производится по требованию заинтересованного лица.

Первичный коллектив охотников дер. Плоскинь согласен взять на себя обязательства по поддержанию порядка на территории охотничьих угодий, предоставляемых в аренду по результатам аукциона.

Брестский облисполком в течение пяти рабочих дней после согласования Министерством лесного хозяйства и территориальными органами Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь биолого-экономического обоснования охотничьих угодий и проекта решения о предоставлении охотничьих угодий в аренду принимает решение о предоставлении охотничьих угодий в аренду и заключает с юридическим лицом договор аренды охотничьих угодий сроком на 10 лет.

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Узденского райпо (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

**Лот 1: здание магазина,** общ. пл. **87,0 кв. м**, регистрационное удостоверение от 04.05.1999 №5643, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683205101000027, площадью 0,0771 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, **Узденский район, Слободской с/с, д. Каменое.**

Начальная цена с НДС – **4 644,36** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 464,44 бел. руб.). Стоимость снижена на 65%.

**Лот 2: здание магазина, общ. пл. 112,0 кв. м**, регистрационное удостоверение от 04.05.1999 №5649, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683208201000070, площадью 0,0783 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Старые Морги**.

Начальная цена с НДС – **7 155,70** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 715,57 бел. руб.). Стоимость снижена на 65%.

**Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 25.04.2017, 12.04.2017, 20.06.2017 и 02.09.2017. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **29.11.2017** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.11.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Планар» проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания цеха деревообработки**, общей площадью **1 307,1 кв. м**, инв. №601/С-27937, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623288005101000004 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью 0,3209 га, по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 20Г.

Здание цеха деревообработки сдается в аренду *(сведения можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20%) – **295 611,46** бел. руб. **Стоимость снижена на 30%.** Задаток 10% от начальной цены (**29 561,15** бел. руб.), перечисляется на **р/с №BY55BPSB30121082600169330000, в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 13.07.2017, 10.10.2017. Аукцион состоится **29.11.2017** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.11.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

■ Духоўная асвета

# БОЖАЕ СЛОВА ПА-БЕЛАРУСКУ

## Свяшчэннае Пісанне на роднай мове прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

**Пераклад «Новага Запавету Госпада Нашага Ісуса Хрыста» — гэта вынік шматгадовай складанай працы, адзначыў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел на ўрачыстай імпрэзе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Кніга падрыхтавана Выдавецкім саветам Беларускай праваслаўнай царквы.**

— Можна сказаць, што гэтае выданне сёння з'яўляецца эталонам, таму што ў папярэдніх перакладах Свяшчэннага Пісання сустракаліся недахопы. Гэта ўзор, які будзе і надалей служыць усім людзям, што імкнуцца спазнаць слова Божае і Свяшчэннае Пісанне, мяркуе Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Для выдавецкага савета ёсць падстава паразважаць пра тое, што яшчэ можна зрабіць, каб азначаная кніга была даступная не толькі для шырокага кола чытачоў, але і для багасловаў, гісторыкаў і ўсіх, хто вывучае Свяшчэннае Пісанне.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел выказаў спадзяванне, што кніга стане настольнай для кожнага хрысціяніна.

На актуальнасць выдання для беларусаў звярнуў увагу **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:**

— Сённяшняя падзея нагадвае пра тое, што ў год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання з'явілася кніга, якая замацоўвае беларускія традыцыі ў асэнсаванні Новага Запавету праваслаўнай веры. Мне хацелася б, каб гэтая падзея стала падставай для новых крокаў уз'яднання царквы з грамадствам, для фарміравання ўплыву царквы на развіццё нашай суверэннай незалежнай Беларусі.

«Новы Запавет Госпада Нашага Ісуса Хрыста» на сучаснай беларускай мове прадставілі ў Полацку падчас святкавання Дзён беларускага пісьменства. Такім чынам, Свяшчэннае Пісанне існуе ў кніжнай прасторы нашай краіны ўжо больш як два месяцы. За гэты час перакладчыкі атрымалі шмат водгукаў. Сярод іх не раз гучалі словы пра тое, што Свяшчэннае Пісанне ўжо перакладалася на беларускую раней. Ад імя Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы, якая займалася перакладам у супрацоўніцтве з Біблейскім таварыствам Беларусі, **протаіерэй Сергій ГАРДУН** растлумачыў, чаму менавіта «Новы Запавет Госпада Нашага Ісуса Хрыста» можна лічыць афіцыйным перакладам. Ён адзначыў, што перакладчыкі ўважліва азнаёміліся з працай папярэднікаў, прааналізавалі плюсы і мінусы ранейшых выданняў, каб дасягнуць найлепшых вынікаў у сваёй справе.


Фота БЕЛТА.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Алена АНІСІМ** заўважыла, што «Новы Запавет Госпада Нашага Ісуса Хрыста» — гэта падарунак для хрысціян, у аснове якога ляжаць вера і любоў да людзей.

— Бягучы год напоўнены падзеямі і слаўнымі датамі, якія духоўна сілкуюць наша жыццё. Сённяшняя прэзентацыя перакладу Свяшчэннага Пісання выдатная нагода па-новаму ацаніць ролю і значэнне духоўнай асветы, сцвярджае Алена Анісім.

«Новы Запавет Госпада Нашага Ісуса Хрыста» перадалі ў дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, а Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел уручыў дыпломы і медалі людзям, якія зрабілі заўважны ўнёсак у стварэнне выдання.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Парламенцкі дзённік

# З акцэнтам на агульную выгаду

## Завяршыўся афіцыйны візіт Уладзіміра Андрэйчанкі ў Судан

**Як паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, напрыканцы візіту старшыня ніжняй палаты нашага парламента Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з прэзідэнтам Рэспублікі Судан Амарам аль-Башырам.**

Былі абмеркаваны ключавыя пытанні беларуска-суданскіх адносін — з акцэнтам на рэалізацыю ўзаемавыгадных праектаў у святле вынікаў перагавораў прэзідэнтаў абедзвюх краін, якія прайшлі ў студзені бягучага года ў Хартуме.

«У прыватнасці, уздымаліся пытанні ўзаемадзеяння ў галіне прамысловай кааперацыі, сельскай гаспадаркі, асваення прыродных рэсурсаў Рэспублікі Судан, — інфармуе прэс-служба. — Канстатавалі высокі ўзровень палітычных адносін, у тым ліку сувязяў па лініі парламентаў «як мастоў, якія аб'ядноўваюць дзве дружалюбныя краіны». Прэзідэнт Рэспублікі Судан даў высокую ацэнку ролі парламентарыяў у прасоўванні гандлёва-эканамічных, гуманітарных сувязяў і дзелавых кантактаў дзвюх краін.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## РАЗМОВЫ, ЯКІЯ ПРЫНОСЯЦЬ КАРЫСЦЬ

**У краіне, па суботняй традыцыі, 18 лістапада тэлефонныя званкі будуць раздавацца ў кабінетах гарадскіх, раённых і абласных адміністрацый. Ва ўсіх кутках краіны свае пытанні і праблемы людзі змогуць адрасаваць напрамую прадстаўнікам улады. Колькасць зваротаў істотна памяншаецца, аднак прадстаўнікі мясцовай улады па-ранейшаму на сувязі.**

**З 9.00 да 12.00 званкі будуць прымаць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8-023 275 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Іван Эдуардавіч ЛІПНІЦКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ Дыскусійная пляцоўка

# ЯК ПАДСТРОІЦЦА ПАД РЫНАК ПРАЦЫ?

## У Мінску праходзіць форум «Студэнцкая восень»

**Рэспубліканскі прафсаюзны форум студэнцтва праводзіцца другі раз. Сёлета ён сабраў каля тысячы ўдзельнікаў з 43 вышэйшых навучальных устаноў краіны.**

— Асноўная ідэя — стварыць дыскусійную пляцоўку, каб сучасная моладзь магла ўзняць пытанні размеркавання і працаўладкавання, паўдзельнічаць у творчых конкурсах. Да форуму далучыліся і замежныя госці — з Эстоніі, Казахстана, Расіі, — расказвае **начальнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Глеб ЛАПІЦКІ.**

Студэнты ўніверсітэтаў удзельнічалі ў саміце, дзе разам з экспертамі абмяркоўвалі, як сістэме адукацыі падстроіцца пад патрэбы рынка працы. Праходзіць таксама конкурс прафсаюзных праектаў. Так, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы прэзентаваў мабільную праграму прафкама. Яна шматфункцыянальная: гэта і даведнік нарматыўнай дакументацыі, якую часцей запытваюць студэнты (тая ж інфармацыя аб матэрыяльнай дапамозе), і каляндар мерапрыемстваў, і сродак зваротнай сувязі. Праграма таксама рассылае важныя паведамленні — напрыклад, не забыць напісаць заяву на інтэрнат. Студэнты гродзенскага ўніверсітэта ўжо карыстаюцца ёй у тэставым рэжыме. Поўная версія, мяркуецца, будзе запушчана ў лютым. А Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія распрацавала для членаў прафкама спецыяльную дысконтную картку.

— Мы задумаліся над тым, каб увасобіць у жыццё рэальныя меры сацыяльнай падтрымкі. Кожны студэнт, уступаючы ў прафсаюз, атрымлівае дысконтную картку бясплатна. Яна дае зніжку ад 3 да 15 працэнтаў. На сёння мы заключылі дагаворы аб партнёрскім супрацоўніцтве з 12 прадпрыемствамі Горак — гэта кавярні, цэнтры друкаваных паслуг, таксі, цырульні, — дзеліцца вопытам **старшыня прафкама студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Віталь СЯДЗЮК.**

Сёння ўдзельнікі форуму наведаюць буйныя прадпрыемствы і арганізацыі сталіцы, каб лепш даведацца аб выбранай прафесіі і аб тым, што іх чакае на працоўным месцы. Запланаваны экскурсіі на Мінскі завод халадзільнікаў, МТЗ, Мінскі механічны завод імя Вавілава, аддзяленне Беларускай чыгункі і іншыя прадпрыемствы сельскагаспадарчай, будаўнічай галін, лёгкай прамысловасці, адукацыі і аховы здароўя.

Падчас форуму ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў працавала таксама прафарыентацыйная выстава ўніверсітэтаў, каб сталічныя школьнікі, якія яшчэ не вызначыліся, куды паступаць, змаглі больш даведацца пра розныя спецыяльнасці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ПАДАЎ МОКРЫ СНЕГ...

## А сіноптыкі чакаюць у аўторак невялікі мінус нават удзень

**У наступныя двое сутак у Беларусі захаваецца цёплае надвор'е, ападкаў будзе няшмат, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу днём па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі: мокры снег, дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад нуля да 5 цяпла. А ў нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі з перавагай мокрага снегу. Уначы — ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — ад нуля да плюс 5.

У панядзелак і аўторак на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць больш халодная няўстойлівая паветраная маса з поўначы Еўропы. У панядзелак на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 2, удзень — ад нуля да плюс 5 градусаў. У аўторак уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень пераважна па паўднёва-заходняй частцы краіны чакаецца кароткачасовыя ападкі. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да нуля, днём — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Студэнт... Як шмат у гэтым гуку!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У 2016/2017 навучальным годзе ў 51 установе вышэйшай адукацыі навучалася 313 тысяч студэнтаў. Па іх колькасці ў разліку на 10 тысяч насельніцтва Беларусь мела самы высокі паказчык сярод краін СНД — 330 чалавек. Услед за намі ідуць Украіна, Арменія, Расія, Кыргызстан, Казахстан, Таджыкістан, Малдова, Азербайджан.

У Беларусі сёння функцыянуе 34 універсітэты, 9 акадэмій і 8 інстытутаў, пераважная большасць з іх — дзяржаўныя. Дзевяць з дзесяці студэнтаў навучаюцца ў дзяржаўных ВНУ. Падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй ажыццяўляецца па 15 профілях адукацыі, якія ўключаюць больш за 400 спецыяльнасцяў і кірункаў. На дзённай форме навучання веды атрымліваюць 172,6 тысячы чалавек, на завочнай — 139,2 тысячы, вячэрняй —1,4 тысячы. Пры гэтым колькасць дзяўчат, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю, крыху большая за колькасць хлопцаў: на 100 хлопцаў-студэнтаў прыпадаюць 124 дзяўчынытудэнткі.

Самымі запатрабаванымі застаюцца сярод моладзі спецыяльнасці эканамічнага і юрыдычнага профіляў. Па іх навучаецца траціна ўсіх студэнтаў. Таксама карыстаюцца попытам спецыяльнасці тэхнічнага профілю — да іх праявіў цікавасць кожны пяты студэнт. З педагогікай звязвае сваю будучыню кожны дзясяты. Спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю выбіраюць восем працэнтаў студэнтаў, медыцынскія — сем працэнтаў.

Дзяржава заахвочвае маладых людзей, якія імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю. У 2016/2017 навучальным годзе 91 тысяча студэнтаў, або кожны другі студэнт дзённай формы навучання, атрымлівалі стыпендыю. У студэнцкіх інтэрнатах пражывалі 82 тысячы студэнтаў, або 81 працэнт ад агульнай колькасці тых, хто меў патрэбу.

У 2016/2017 навучальным годзе ў беларускіх ВНУ навучалася больш за 15 тысяч грамадзян замежных дзяржаў, што складае пяць працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў. З іх 73 працэнты з'яўляюцца грамадзянамі краін СНД, прадстаўнікоў Кітая і Ірана — па пяць працэнтаў, Нігерыі — 3,5 працэнта, Лівана і Шры-Ланкі — па 1,9 працэнта, Індыі — 1,5 працэнта, Ірака — крыху больш за адзін працэнт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Абмен прафесійным і творчым досведам

**Учора ў Інстытуце журналістыкі БДУ адбылася 19-я Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка-2017: стан, праблемы і перспектывы».**

Як адзначыў ва ўступным слове **дырэктар інстытута Сяргей ДУБОВІК,** сёлетняя канферэнцыя чарговы раз прадэманстравала цікаўнасць міжнароднай навуковай супольнасці да тэм, якія былі вынесены на разгляд навукоўцаў, прадстаўнікоў айчынных і замежных СМІ, дыпламатаў, акрэдытаваных у Мінску пасольстваў. У дыялогу ўдзельнічала больш як 30 навукоўцаў і даследчыкаў з вышэйшых навучальных устаноў краін далёкага і блізкага замежжа.

Яны абмеркавалі, у прыватнасці, перспектывы далейшай работы традыцыйных СМІ ў новых абставінах, іх месца і ролю ў нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. На думку ўдзельнікаў размовы, канферэнцыя зрабіла салідны ўнёсак у асэнсаванне сучаснага стану медыйнай сферы, дапамагла вызначыць верагодныя шляхі развіцця беларускай журналістыкі на найбліжэйшую будучыню і больш далёкую перспектыву ўвогуле.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# Колькі працягнецца «мёртвы» сезон?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## «ЗВЕРХУ» ДАПАМАГЛІ

Колькасць турыстаў з кожным годам павялічваецца. Сёлета канал наведала каля 85 тыс. чалавек, з іх 17 тысяч — бязвізавых, паведамілі ў абласным упраўленні спорту і турызму. Праз пункт пропуску на канале прыбыло ў дзесяць разоў больш гасцей, чым летась. Бывалі дні, калі тут назіраўся сапраўдны аншлаг. Падчас святаў, вела- і водных марафонаў, аўтафестываляў і спартыўна-турыстычных спаборніцтваў. Але амаль усе гэтыя мерапрыемствы праводзяцца ў цёплы сезон. А з восені наступае зацішша.

Між тым брэндавы для Гродзеншчыны аб'ект можа выклікаць цікавасць у любое надвор'е. Гэтага дабіліся нашы суседзі — палякі, якія ў межах канала размясцілі безліч кемпінгаў, баз, гасціниц на любы густ. Вядома, трэба прыняць пад увагу, што на польскім баку канал увесь час быў суднаходны, з добрай інфраструктурай. А вось 21 км воднай артэрыі з беларускага боку прыведзены ў належны стан толькі гадоў адзінаццаць таму.



Гаспадар аграсядзібы Генадзь САДКОЎСКІ.

Тэрмін невялікі, і першыя крокі ў асваенні турыстычнага патэнцыялу канала зроблены. Гэтаму спрыяе і дзяржаўная падтрымка, адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ,** падводзячы вынікі работы бязвізавага рэжыму на пасяджэнні абласнога выканаўчага камітэта. Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што створана нямала перадумоў, каб развіваць гэты кірунак. Дарэчы, першы ўказ быў накіраваны на рэканструкцыю канала, наступны — даваў дазвол на стварэнне свабоднай турыстычнай зоны ў межах парку «Аўгустоўскі канал», і, нарэшце, сёлета быў выдадзены рэвалюцыйны дакумент па бязвізавым наведванні тэрыторыі парку. Зараз гэта зона павінна забяспечваць экспарт паслуг, стварыць працоўныя месцы, прыносіць прыбытак у бюджэт, падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. Застаецца стварыць умовы, каб турыст мог прыехаць сюды не толькі летам.

## ШУМІЦЬ КАМЫШ...

Аграсядзібу **Генадзя САДКОЎСКАГА** можна ўбачыць з трасы, якая вядзе на канал. Месца зручнае. Домікі здалёк выглядаюць казачнымі — драўляныя, акуратныя, тры ў радок. Калі трапляеш на тэрыторыю сядзібы, прыемнае ўражанне толькі ўзмацняецца. Вядзе гасцявы бізнес жонка, а ў далейшым, спадзяецца Садкоўскі, сямейную справу працягне дачка. А да гэтага часу гаспадар плануе пашырыць і добраўпарадкаваць тэрыторыю, дзе зараз расце камыш і кавыль.

— Толькі мы сталі прыводзіць у парадак землі, нас абвінавацілі, што гэта захоп, — дзеліцца Садкоўскі. — Балота належыць сельскагаспадарчаму прадпрыемству, але ж толькі намінальна, бо якія тут работы можна весці? Гэта ж прыродаахоўная зона. Кажу — выдзеліце мне ўчастак. У райвыканкаме адказалі, што трэба мяняць прызначэнне земляў. Гэта можа зацягнуцца надоўга.

Тэрыторыю, якая зараз нагадвае звычайнае балота, прадпрымальнік разлічвае расчысціць, хацеў бы пракласці тут сцежкі, паставіць альтанкі, мангалы, зрабіць пляцоўкі для дзяцей, лодачны прычал. Іх сусед прапануе абсталяваць поле для гольфа. Калі здзейсняцца гэтыя планы, Садкоўскі не бярэцца загадваць, бо бачыць, як марудна ідзе асваенне тэрыторыі.

У адміністрацыі СЭЗ «Гродnaінвест» пацвердзілі, што гэта тэрыторыя асаблівага дзяржаўнага рэгулявання, прыродаахоўная зона і кожны крок трэба ўзгадняць з міністэрствамі. Для засваення тут ёсць 11 інвестпляцовак па 25 га ў межах вёсак, але ахвотных заняцца будаўніцтвам вялікіх комплексаў не знаходзіцца.

## ДА НОВАГА СЕЗОНА

Аграсядзібы гатовыя прымаць турыстаў круглы год. Усяго іх у зоне канала 11. Але сёлета яны сутыкнуліся з праблемай размяшчэння вялікіх груп — па 50—60 чалавек. Ужо некалькі гадоў ідзе гаворка аб будаўніцтве хостэла — недарагога начлегу паблізу канала. І такая будоўля вядзецца, праўда, таксама марудна. Гродзенская гарадская арганізацыя рамантуе пад хостэл былы інтэрнат, але яго здача пераносіцца з году ў год. Чарговы раз тэрмін яго здачы перанесены на наступны сезон.

На той жа час чакаецца завяршэнне рэканструкцыі палацава-паркавага комплексу «Свяцк» і былой сядзібы Гурскіх, дзе таксама вядуцца работы не першы год. Гэта будуць самыя значныя турыстычныя комплексы ў зоне канала.



Аграсядзіба «У Іваныча».

Як паведаміў падчас нарады **старшыня Гродзенскага райвыканкама Ян ВАСІЛЕЎСКІ,** ажыўленне ў зоне канала прыкметнае. Праўда, пакуль з боку насельніцтва, а не прадпрымальнікаў — многія купляюць хутары, разводзяць коней. Мясцовыя ўлады таксама не стаяць убаку. У рамках трансгранічнага супрацоўніцтва вядзецца рамонт дарог, чарговыя праекты заяўлены і на наступны год. Літаральна нядаўна адкрыта некалькі музеяў, у тым ліку на адным са шлюзаў. Раённы бюджэт выдзеліў на гэта 54 тыс. рублёў. Праўда, акупляюцца яны павольна. На думку Яна Васілеўскага, турыстычным фірмам варта звярнуць увагу на гэтыя аб'екты і на тыя мерапрыемствы, якія ладзяцца ў бязвізавай зоне парку «Аўгустоўскі канал». Дарэчы, колькасць турфірмаў, якія спрыяюць наведванню парку, павялічылася ў чатыры разы.

## ПАЛЯЦЕЦЬ НА ШАРЫ

Каб задзейнічаць канал круглы год, першнаперш трэба вызначыцца з канцэпцыяй яго развіцця. Спецыялісты СЭЗ прапануюць развіваць парк «Аўгустоўскі канал» як цікую зону адпачынку з перавагай гасцінічнага сэрвісу. Аднак гасцініцы не будуць запатрабаваны ў міжсезонне. Больш прывабнай падаецца прапанова аб актыўным адпачынку, на які арыентаваны, напрыклад, суседзі-палякі. Гэта пацвярджае прыклад Аўгустова. Але для гэтага, зноў жа, патрэбна інфраструктура, заўважыў падчас нарады ў аблвыканкаме **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Сяргей РАЎНЕЙКА.** На яго думку, трэба засяродзіць увагу на развіцці асобных зон. Напрыклад, стварыць этнаграфічную вёску. Прапанаваць паслугі па катанні на конях, а можа, нават і на паветраным шары. Работа парку ва ўмовах бязвізавай зоны паказала, што замежным турыстам гэта месца падабаецца. Іх толькі трэба нечым зацікавіць, і не толькі на працягу трох летніх месяцаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# НЕ ПАЧЫНАЙЦЕ! А ПАЧАЛІ — КІДАЙЦЕ!




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не так даўно рак лёгкага быў лідарам у спісе іншых відаў анкалагічных захворванняў у мужчын, але цяпер апусціўся на другое месца (на першае выйшаў рак прастаты). Здаецца, рак лёгкага адступае? Дзе там! Штогод захваральнасць прырастае на тры працэнты. Летась захварэла каля 4800 чалавек. Нямала для нашай краіны, асабліва калі ўлічыць, што палова гэтых людзей гіне пасля пастаноўкі дыягназу на працягу года. Рак лёгкага дрэнна дыягнастуецца і дрэнна паддаецца лячэнню. (Поспех мае толькі лячэнне на першай стадыі.)

Сёння шмат аматараў пагаварыць пра тое, што рак лёгкага зусім неабавязкова выклікаецца тытунем: маўляў, ёсць жа яшчэ і шкоднае навакольнае асяроддзе. Ёсць. Але і рак лёгкага не адзіная ў гэтым сэнсе праблема: ёсць яшчэ рак ротавай поласці і глоткі, мачавога пузыра, шыйкі маткі... Дарэчы, у Еўропе сёння захваральнасць на рак лёгкага хутчэй расце менавіта сярод жанчын.

Незваротныя змяненні будуць у любога, хто курыць працягла. І ўсё ж такі кідаць трэба. Гэта хоць бы знізіць рызыку развіцця не толькі анкалогіі, але і сардэчна-сасудзістай паталогіі, цукровага дыябету, абструктыўнай хваробы лёгкіх. У групу рызыкі развіцця ўсёй гэтай паталогіі трапляюць і тыя, хто вымушаны жыць, працаваць, адпачываць або проста стаяць на прыпынку побач з залежным ад адной з самых шкодных звычак.

У свеце налічваецца звыш 1 млрд курцоў. Штогод каля 6 млн гінуць ад тытуню і пасіўнага курэння. Гэта 12 працэнтаў усёй мужчынскай і 6 працэнтаў усёй жаночай смяротнасці. Кожны другі курэц памірае ад захворванняў, звязаных менавіта з курэннем. Яно скарачае жыццё на 10 гадоў. Тытунь уносіць асноўны ўклад у развіццё інфаркту міякарда, інсульту, сардэчнай недастатковасці, заўчаснае старэнне сасудаў.

Паводле айчынных даследаванняў, у нас кураць 29,6 працэнта насельніцтва, сярод мужчын — 48 працэнтаў, сярод жанчын — 12,6. У гарадской мясцовасці кураць 43 працэнты людзей, у сельскай — 54.

«Праз 5 гадоў пасля развітання з курэннем рызыка развіцця ішэмічнай хваробы сэрца пачынае зніжацца дзесьці ў два разы. Чым раней кінуць курыць, тым, вядома, лепш для нашай прыгажосці здароўя. Калі вы кінулі ў 30, то павялічваеце працягласць жыцця на 10 гадоў, а калі ў 50, то ўжо толькі на 6», — кажа **загадчыца лабараторыі артэрыяльнай гіпертаніі РНПЦ «Кардыялогія» Вольга ПАЎЛАВА.**

Каля 70 працэнтаў сярод тых, хто спыніўся, пачынаюць курыць зноў на працягу першых трох месяцаў. Аднак з кожнай наступнай спробай «завязаць» імавернасць канчатковага спынення ўзрастае. Некаторым, праўда, патрабуецца дапамога ўрачоў-спецыялістаў, якія працуюць у наркадыспансерах.

— У нас функцыянуе кабінет па лячэнні нікацінавай залежнасці ў амбулаторных умовах, — паведамляе **загадчыца сектара Рэспубліканскага цэнтра наркалагічнага маніторынгу і прэвенталогіі РНПЦ псіхічнага здароўя Іна БЯЛАЕЦ.** — У адзін сеанс коштам 41 рубель уваходзіць кансультацыя ўрачоў псіхіятра-нарколага і псіхатэрапеўта, псіхолага. Можа быць прызначана медыкаментознае лячэнне. Многія пацыенты маюць у першую чаргу моцную псіхалагічную залежнасць, яны кажуць, што ім трэба нечым заняць рукі, што гэта штосьці накшталт «эфекту соскі».

Паводле апошніх даследаванняў, частка людзей, дзесьці каля 10 працэнтаў, мае гены, якія перашкаджаюць лёгка развітацца з «соскай». Таму анколагі кажуць, што самы эфектыўны спосаб кінуць курыць — выдаліць лёгкае. Дапамагае 70 працэнтам онкапацыентаў. Аднак астатнія 30 робяць зацяжку адразу пасля аперацыі. І тут можна западозрыць генетычную залежнасць. Не за гарамі той час, калі можна будзе расшыфраваць сваю генетычную карту і выявіць гены, адказныя за залежнасць ад тытуню.

За мяжой у розных арганізацыях ёсць вопыт заахвочвання работнікаў, якія не кураць. Праўда, правярыць/паверыць, што чалавек сапраўды не курыць, няпроста. У нашай краіне больш арыентуюцца на стымуляванне здаровага ладу жыцця ў прынцыпе — кажуць, сям-там набываюць абанементы ў басейн, прэміруюць самых здаровых. Шкада толькі, што практыка не атрымлівае шырокага распаўсюджвання.

Тэрыторый, цалкам свабодных ад курэння, у нас пакуль малавата. Хоць яны ёсць, і гэта добра. Дзейнічаюць і іншыя добрыя меры, закліканыя ўскладніць жыццё курцу і вытворцу тытунёвай атруты. На парозе і поўны пераход на новую ўпакоўку — з карцінкамі і надпісам аб шкодзе курэння памерам на палову пачкі, з абодвух бакоў. З 15 лістапада гэтага года вытворцы павінны ажыццяўляць выраб цыгарэт паводле новых патрабаванняў. Праўда, пакуль яшчэ да поўнай рэалізацыі ў абароце будзе знаходзіцца прадукцыя старога ўзору, выпушчаная да ўстаноўленай даты. Паводле замежных даных, страшныя карцінкі пра імпатэнцыю і многія іншыя негатыўныя наступствы, звязаныя з курэннем, дапамагаюць некаторым урэшце завязаць з гэтым.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Калейдаскоп

# БЫВАЙ, ВОСЕНЬ!

## 5 фільмаў супраць сезоннай хандры

**Калі раніца ўжо дыхае ў спіну зімовым холадам, а прагноз надвор'я вымушае спалучаць сагравальнае і непрамакальнае, вельмі добра набраць па засеках прыгожых фільмаў з восеньскім зместам і аздабленнем — і прагледзець іх у вольны час па адным альбо цэлым пачкам. На сто працэнтаў як антыдэпрэсант гэты метад, можа, і не спрацуе, але настрой дакладна палепшыць.**
**Мы прыгадалі некалькі кінастужак, якія варта ўключыць у гэты спіс.**

### «Восеньскі марафон» (1979)



Гісторыя пра таленавітага педагога і перакладчыка Бузыкіна, нерашучы характар якога сапсаваў гаспадару ўсё жыццё, паводле першапачатковай задумкі мусіла стаць камедыяй, а стала адной з візітовак знакамітага рэжысёра Георгія Данелія. Бо справа тут значна глыбейшая, чым няўменне сказаць «не»: ні жонцы, ні палюбоўніцы, кожная з якіх жадае быць адзінай і каханай, ні пітушчаму суседу-філосафу, якому патрэбна кампанія для выпіўкі і размоў, ні ўчэпістай аднакурсніцы, якая бессаромна скарыстоўвае талент Бузыкіна для сваіх перакладаў, ні замежнаму прафесару, які запрашае бегаць з ім штораніцы. Справа ў тым, што герой, калі рашаецца нарэшце стаць іншым чалавекам, церпіць фіяска, бо арганічна не здатны прайсці абраным шляхам да канца. Ён можа толькі бегчы трушком, не спыняючыся і не азіраючыся, пераадольваючы гэты бясконцы марафон аж да зыходу жыцця...

І хоць многім савецкім глядачам Данелія не дагадзіў сваёй «сумнай камедыяй» — адны крыўдзіліся, што герой так і не сышоў ад жонкі, другія, наадварот, што канчаткова да яе не вярнуўся, — замежная публіка і крытыка стужку ацаніла высока. На фестывалі ў Сан-Себасцьяне карціна атрымала галоўны прыз, на Венецыянскім фестывалі — прэмію ад журналістаў за найлепшую мужчынскую ролю (Яўген Лявонаў) і прыз Міжнароднай федэрацыі кінапрэсы. У 1981 годзе карціну нават планавалі вылучыць на «Оскар», але з-за вайны ў Афганістане гэтага не здарылася.

#### Цікавінкі

«Дацкага прафесара» Хансена сыграў рэальны замежнік, карэспандэнт часопіса «Шпігель» Норберт Кухінке. Яго, уласна, меркавалася прадставіць як нямецкага прафесара, але ўзніклі пярэчанні з боку ЦК КПСС, які патрабаваў дакладнасці: адкуль узяўся прафесар, з буржуазнай ФРГ або дэмакратычнай ГДР? Пры любым з гэтых раскладаў фільм было б немагчыма прадаць на нямецкі рынак, таму нацыянальнасць Хансена змянілі на нейтральную.

Наталля Гундарава сыграла немаладую жонку прафесара (які, паводле фільма, і сам далёка не юнак — 46 гадоў), маці ўжо дарослай дачкі. Насамрэч на момант выхаду карціны актрысе быў усяго 31 год, і яна была маладзейшай за Марыну Няёлаву, якая сыграла ролю палюбоўніцы.

### «Аднойчы» (2007)



Дзесяць гадоў таму гэта ірландская музычная меладрама заслужана атрымала «Оскар» за лепшую песню, а пазней была паспяхова адаптавана ў тэатры на Брадвеі. У невялікай, але насычанай гісторыі эмацыянальныя штуршкі гледачам даюць і вонкавае, і ўнутранае: «жывыя» непастановачныя здымкі, прыгожыя восеньскія пейзажы і ўтульныя вулачкі Дубліна, атмасферная лірычная музыка і гісторыя кахання ірландскага вулічнага музыканта і чэшскай імігранткі, вымушанай падпрацоўваць прыборкай кватэр (дарэчы, абодва галоўныя героі — не прафесійныя акцёры і не акцёры наогул, а прафесійныя музыканты, якія выконваюць у фільме ўласныя песні)... Карацей, сам Стывен Спілберг адзначыў, што атрымаў ад прагляду карціны натхненне на ўвесь год, а легендарны музыкант Боб Дзілан запрасіў музыкаў узяць удзел у сваім сусветным турнэ.

#### Цікавінкі

Цуд у тым, што кіно не проста бюджэтнае, а фантастычна бюджэтнае: яно знята цягам усяго 17 дзён на дзве звычайныя лічбавыя камеры.

Фільм паслужыў пачаткам сапраўднага рамана паміж выканаўцамі галоўных роляў, якія і дагэтуль былі знаёмыя шмат гадоў.

### «Салодкі лістапад» (2001)

Рамантычная меладрама, якая прымушае нават зацыкленых на ўласных праблемах меланхолікаў зноў удыхнуць на ўсе грудзі і пачаць радавацца кожнаму імгненню паўсядзённага жыцця. Варта толькі пазнаць сябе ў галоўным героі фільма — зашпіленым на ўсе гузікі рэкламным агенце Нэльсане Мосе, тыповым працаголіку, які не ўяўляе сабе іншага сэнсу ў жыцці. Пакуль аднойчы не сустракае спакуслівую і эксцэнтрычную Сару. Яна просіць пабыць яе хлопцам адзін месяц, а ўзамен абяцае цалкам змяніць яго светаўспрыманне. Адметнасць сітуацыі ў тым, што Сара смяротна хворая на рак, а Нэльсан — адзін з многіх «пацыентаў», лёс якіх дзяўчына выпраўляе...



#### Цікавінкі

Кінастудыя Warner Brothers выразала са стужкі некаторыя сексуальныя сцэны, з-за чаго выканаўца галоўнай ролі Кіяну Рыўз вельмі засмуціўся, палічыўшы, што фільм страціў пэўную долю пераканаўчасці.

Фільм — рымейк аднайменнай карціны 1968 года — у адрозненне ад свайго папярэдніка — быў сустрэты крытыкамі вельмі непрыязна і атрымаў ажно тры намінацыі на антыпрэмію «Залатая маліна» — але, тым не менш, пры бюджэце ў 40 мільёнаў долараў сабраў звыш 65 мільёнаў у сусветным пракаце і ўвайшоў у адмысловы амерыканскі рэйтынг «250 фільмаў, якія хочацца глядзець і пераглядаць».

### «Сяброўка Восень» (2002)



Гэта 4-серыйная меладрама — першы мастацкі тэлесерыял, зняты пасля зацяглай паўзы «Беларусьфільмам» сумесна з расійскімі кінематаграфістамі.

Пра што фільм? Пра сябровак Аню і Жэню, стасункі якіх з дзяцінства прайшлі выпрабаванне часам і адлегласцю — жывучы ў розных гарадах, жанчыны ведаюць, што абедзве яны па першым сігнале прыйдуць на дапамогу адна адной. І ўсё ж абсалютнай ідыліі не бывае. Жэня ледзь стрымлівае слёзы, глядзячы на Аніну дачку, — сама яна пасля чарнобыльскай аварыі дзяцей мець не можа. Аня ж, у сваю чаргу, мела няшчасце з першага погляду закахацца ў будучага мужа сяброўкі і цяпер з усіх сіл стараецца не перашкаджаць сямейнаму шчасцю... Пры чым тут восень, якая трапіла ў назву карціны? Як растлумачыла выканаўца адной з галоўных роляў актрыса Ганна Вартанян, «проста ўвосень плакаць зручней: слёз з-за дажджу не бачна». Словам — так, гэта адна з тых самых меладрам, пад мелодыі з якіх многія гледачы плачуць.

#### Цікавінкі

Сцэнарый «Дзіця, сястра мая», які напісала для карціны літаратар і журналіст Юлія Ляшко, у свой час атрымаў два галоўныя дыпломы — на айчынным Нацыянальным кінафестывалі ў Брэсце і расійскім «Залатым Віцязі».

Стваральнікі серыяла адзначылі ў цітрах, што фільм заснаваны на рэальных падзеях.

### «Легенды восені» (1994)



Адзін з герояў гэтай ваеннай і сямейнай драмы, ураджэнец амерыканскага штата Мантана палкоўнік Ладлаў шмат гадоў ваяваў з індзейцамі, знішчаючы цэлыя вёскі. Але цяпер ён на пенсіі, выхоўвае трох сыноў і перамяніў сваё меркаванне наконт індзейцаў — больш за тое, разам з сям'ёй жыве на тэрыторыі племені дакота. Аднойчы сярэдні сын прыводзіць у дом нявесту, Сюзану, якая ракавым чынам змяняе жыццё сям'і, бо ў яе закахаліся ўсе трое братоў... Жаніх дзяўчыны ў выніку загінуў на франтах Першай сусветнай вайны, адзін з яго братоў адпомсціў забойцам па звычаях індзейцаў і збег ад цывілізацыі, а другі дабіўся ад каханай згоды на шлюб, але канчаткова пасварыўся з бацькам. І ўсё гэта — на маштабным палатне эмацыянальных жарсцяў, вайны і восені...

#### Цікавінкі

На ролю галоўнага героя спачатку быў запрошаны Джоні Дэп, але з-за занятасці ў іншых праектах ён фізічна не паспяваў на здымкі, і роля дасталася Брэду Піту, якому давялося вучыцца скакаць вярхом.

Здымкі ў Канадзе дазволілі рэжысёру зэканоміць два мільёны долараў — праўда, давялося змяніць некалькі гарадоў, угаворваючы іх улады даць дазвол на высяканне некалькіх дрэваў.

Шлях карціны ад задумкі да выхаду на экраны склаў ажно 17 гадоў!

**Вікторыя ЗАХАРАВА.** *zaharava@zviazda.by*

■



# ШАШКІ

**Выпуск №50**

У першай палове кастрычніка ў Таліне прайшлі чэмпіянаты свету па міжнародных шашках сярод мужчын і жанчын. За вышэйшыя тытулы змагаліся 95 спартсменаў з 30 краін, сярод якіх чэмпіёны свету розных гадоў і 41 міжнародны гросмайстар.

У чэмпіянаце свету сярод мужчын прынялі ўдзел 79 спартсменаў. Спачатку ў трох групах па швейцарскай сістэме ў 9 тураў шашысты змагаліся за чатыры пуцёўкі, якія даюць права на ўдзел у фінальным турніры па кругавой сістэме сярод дванаццаці наймацнейшых. Канкурэнцыя была вельмі высокая, дастаткова сказаць, што ў фінал не здолеў прайсці дзеючы чэмпіён свету Рул Бомстра (Нідэрланды). Удала згуляў мінскі гросмайстар Яўген Ватуцін. У сваёй групе на папярэднім этапе ён здолеў прабіцца ў фінал з чацвёртага месца, дзе фінішаваў дзясятым. А чэмпіёнам свету стаў расійскі гросмайстар Аляксандр Шварцман.

У чэмпіянаце сярод жанчын прынялі ўдзел 16 спартсменак, якія вялі барацьбу за тытул па кругавой сістэме. Сярэбраны медаль заваявала міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч (Мінск). На пятым месцы яе сястра Дар'я. А чэмпіёнкай свету 16-ы раз стала Зоя Голубева (Латвія), якая таксама нарадзілася ў Мінску і першы свой сусветны тытул выйграла, будучы членам зборных камандаў БССР і СССР. Цікава, што Яўген і Зоя доўгія гады трэніраваліся пад кіраўніцтвам Міхаіла Каца — заслужанага трэнера БССР і СССР, які 10 лістапада адзначыў свой сямідзесяцігадовы юбілей.

Паглядзіце цікавыя прыклады гульні.

**№109** А. Ідрысава — В. Балтажы

**Белыя простыя шашкі:** 25, 30, 31, 32, 33, 34, 35, 36, 37, 38, 42, 43, 48, 49 (14).

**Чорныя простыя шашкі:** 3, 4, 6, 8, 9, 11, 12, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 21 (14).

Чорныя правялі камбінацыю і праніклі ў дамкі. Пакажыце шлях да перамогі самастойна.

На дыяграме №110 пазіцыя, складзеная вядучым аддзела. Прапануем нашым чытачам вызначыць вынік пры наймацнейшай гульні за абодва колеры. Чарга ходу за белымі.

**№110**

**Белыя простыя шашкі:** a3, c1, d2, e1, e3, e5, f2 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** a7, b2, b4, c5, g7, h4, h8 (7).

Для самастойнага рашэння прапануюцца яшчэ дзве кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№111**

**Белыя простыя шашкі:** a3, b4, c3, d2, e1, f2, f6, h2 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, c7, d6, d8, e7, f4, g3, h4, h8 (9).

**№112**

**Белыя простыя шашкі:** b2, c1, d4, e3, f4, h6 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b4, b6, d6, f6, f8, g7, h2 (7).

**№110**



Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

**Праверце свае рашэнні:** выпуск №49 ад 03.11.2017 г.

**№105** 45...ha1?? 46.hg7! ah8 47.fe5 hg1 48.ba7 X.

**№107** 14.dc3 fe7! (14...fe5? 15.ab6! X).

**№108** 1.23-19 14:34 2.33-29 34:32 3.08-02 17:08 4.02:31 27:36 5.26:37 36-41 6.37:46+.

Дакладныя адказы даслалі І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), А. Ліцьвінаў, В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

***Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru***

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**



## Пятніца, 24 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 2.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15** Зона Х (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.40, 19.20 Серыял «Дзяжурны ўрач» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.45** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25, 17.05 Серыял «Райскае месца» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Клуб рэдактараў» (16+).
**22.30 Меладрама «Найлепшы сябар сям'і» (16+).**
**2.20** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.20** «Тэлебарометр».
**9.05, 17.05 Серыял «Жаночы рай» (16+).**
**11.10** «Тата зможа?» (16+).
**12.10 Серыял «Каманда» (16+).**
**14.05, 19.25** «Амерыканскі жаніх» (16+).
**15.10 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.15, 0.35** «Нічога сабе ньюз».
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**20.25** «Паненка-сялянка» (16+).
**21.30** «Багіня шопінгу» (16+).
**22.00** «Спортлато» 5 з 36, «КЕНО».
**22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Варэнікі з чарніцамі на казіным малацэ.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Ясенін». Маст. фільм (16+).**
**9.20, 18.00** «Легенды кіно». Уладзімір Басаў (12+).
**9.45** «Святыні Беларусі».
**10.10** «Святло далёкай зоркі». Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Яўген Ігнацьеў.
**10.35, 14.35 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
**12.50** «Сіла веры».
**13.15** «Славянскі базар у Віцебску — 2006».
**14.10** «Музеі Беларусі».
**16.05, 21.05** «Панфілаўцы. Праўда аб подзвігу». Дак. фільм (12+).
**16.45, 21.45 «Шчыт і меч». Маст. фільм, заключная серыя (12+).**
**19.30** «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Безыменная зорка».
**20.10** «Беларуская кухня». Макарона запечаная.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Песні пад гітару».
**23.15** «Час кіно». Працы студэнтаў майстэрні народнага артыста Беларусі Віктара Турава і народнага артыста Беларусі Аляксандра Яфрэмава.

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 5-ы тур. «Астана» (Казахстан) — «Вільярэал» (Іспанія).
**9.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 5-ы тур. БАТЭ (Беларусь) — «Црвена Звезда» (Сербія).
**11.55** Спорт-мікс.
**12.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 5-ы тур. «Лакаматыў» (Расія) — «Капенгаген» (Данія).
**14.05** Авертайм.
**14.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**16.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 5-ы тур. «Мілан» (Італія) — «Аустрыя» (Аўстрыя).
**18.30** Хакей для ўсіх.
**19.00, 22.10** Спорт-цэнтр.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Авангард» (Омск). (У перапынках — Авертайм. КХЛ).
**22.25** Баскетбол. Кваліфікацыя да ЧС-2019. Мужчыны. Славенія — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** «Нашы навіны».
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Дзе ж Тунгускі наш метэарыт?» (12+).
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10** «Геніі і ліхадзеі» (12+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20 Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава» (12+).**
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** «Час».
**21.05** «Голас». Новы сезон (12+).
**23.00** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў (16+).
**0.10** «Вячэрні Ургант» (16+).
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.30, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40 «Пантэра» Серыял. Заключныя серыі (16+).**
**12.30** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Фантастыка «Супер 8». (12+).**
**15.50** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца».
**17.10** «Адкрытая размова».
**17.35 «Пад прыкрыццём». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Рускія не здаюцца: зброя спецыяльнага прызначэння». (16+).
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.55** «Пад дахам навукі. Тайныя праекты спецслужбаў». (16+).
**0.45 «Знахар». Серыял. Заключныя серыі (16+).**

### МІР

**7.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**8.35, 2.55 Маст. фільм «Вертыкаль» (0+).**
**10.00** «Любімыя акцёры» (12+).
**10.30, 13.15 Серыял «Востраў непатрэбных людзей» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет». Што стала прычынай гібелі Мартынава? (12+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**17.10, 18.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20 Серыял «Алёнка з Пачытанкі». 1—4-я серыі (12+).**
**23.00** «На ўвесь голас» (12+).
**0.10 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» (12+).**
**1.50** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**2.25** «Кашмар вялікага горада» (16+).
**4.10** М/ф (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 22.20, 23.10 Серыял «Тайны следства — 16». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**0.35 Серыял «Марозава». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.20** «НЗ.by».
**10.25, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.30 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.05 Серыял «Сведкі». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.30, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Месца сустрэчы».
**16.30** «Спецыяльны выпуск». (16+).
**17.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**23.55 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.55, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 16.00** Для дзяцей: «Адказвайка».
**7.30** «Раніца на восьмым».
**11.00 Камедыя «Адпетыя махляры» (16+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.25 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонс» (12+).**
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**18.25 Меладрама «Прыгажуня і пачвара». (12+).**
**20.00 Серыял «Дзеці Арбата».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Саўдзельнік» (16+).**
**23.00 Серыял «Дама пад вэлюмам».**

### ВТБ

**06.00, 15.15** Серыял «Варонiны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
**10.40** Камедыя «Добрай раніцы». (12+).
**12.50** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 19.00** Серыял «Псіхалагіні». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.30** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Як пазбавіцца ад хлопца за 10 дзён». (12+).
**23.40** Жахі «Плецены чалавек». (16+).
**1.40** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30** «Тайна» Моны Лізы «. Дак. фільм.
**7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**7.35** «Легенды сусветнага кіно». Мікалай Сіманаў.
**8.05** «Расія, любоў мая!» «Тайны Унэнэн».
**8.30** «Гай Юлій Цэзар». Дак. фільм.
**8.40** «Кінескоп». XXVII Міжнародны кінафестываль у Котбусе.
**9.20, 14.10** Сусветныя скарбы.
**9.40** Галоўная роля.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Мы з Кранштата». Маст. фільм.
**12.05** «Фенамен Кулібіна». Дак. фільм.
**12.45** «Энігма». Пласіда Дамінга.
**13.30** «Зіхатлівы камень». Дак. фільм.
**14.30** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**15.10** «Марта Аргер. Дачка па крыві». Дак. фільм.
**16.45** «Лісты з правінцыі». Чувашыя.
**17.15** «Фенімар Купер». Дак. фільм.
**17.25** Вялікая опера — 2017.
**19.45** Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя Птушка».
**21.50, 2.05** «Шукальнікі». «Загадкавая смерць мецэната».
**22.35** «Лінія жыцця». Кацярына Раждзественская.
**23.45** «2 Вернік 2».
**0.35** Ганна Нятрэбка, Эліна Гаранча, Наталі Десей, Пётр Бечала, Вольга Перацяцька ў гала-канцэрце на Марсавым полі, Парыж — 2014.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацццяна Візбар. 2008 год (12+).
**6.50, 8.10, 9.40, 11.00, 12.50, 14.25, 15.40, 17.00, 19.00, 20.35, 21.40, 23.00, 1.00, 2.15, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10, 1.10** Маст. фільм «Міраж». (16+).
**8.35** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** Маст. фільм «Позняе каханне». (16+).
**17.40** Маст. фільм «Запасное кола». (12+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1987. 1-я частка. 2010 год (16+).
**19.15** «Вакол смеху». Тэма: «Студэнцтва». 1982 год (12+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Каратэ». 2005 год (12+).
**2.35** Маст. фільм «Заваёўнікі гор». (12+).

### EuroSport 1

**3.00, 11.45, 17.45** Скачкі з трампліна. «Нерасказаная гісторыя». Каміль Стох.
**3.30** Аўтагонкі. Серыя WTCC.
**4.00, 13.15** Лыжныя віды спорту. Чэмпіянат свету. Лахці-2017.
**5.00, 9.00, 22.00** Снукер. Northern Ireland Open.
**7.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Санкт-Морыц-2017.
**8.00, 12.15, 21.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Хохфільцэн-2017.
**10.30, 19.45, 1.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**14.15, 2.05** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**16.15, 18.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету.
**17.30, 2.00** «Гісторыі спартсменаў».
**17.35** Watts.

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Успаміны». (16+).
**2.30** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**2.50** Камедыя «Па версіі Барні». (16+).
**5.20** Камедыя «Выпадковы муж». (16+).
**7.10** Камедыя «Вой, мамачкі!» (18+).
**8.55** Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы». (0+).
**10.35** Камедыя «Ас». (16+).
**12.25** Камедыя «Сведка на вяселлі». (16+).
**14.10** Камедыя «Разбіраючы Гары». (16+).
**16.00** Камедыя «Шпіён па суседстве». (12+).
**17.45** Камедыя «Рэстаран спадара Сепціма». (12+).
**19.30** Камедыя «Ліхтугі Альфрэда». (12+).
**21.20** Камедыя «Аксамітныя ручкі». (16+).
**23.15** Камедыя «Хлапечнік паірландску». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.00** «Доктар І...» (16+).
**8.30** «Трэндзі» (16+).
**9.00** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.35, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 5.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.45** «Здзелка» (16+).
**16.15, 2.55** «Шурачка» (16+).
**17.10** «13 знакаў задыяка» (12+).
**18.10, 2.05** «Бітва рэстаранаў» (16+).
**19.10, 1.15** «Гучныя справы» (16+).
**20.10** «Марлі і я». Камедыя (16+).
**22.15** «Савецкія мафіі» (16+).
**23.05** «Гаспадар мораў». Фэнтэзі (16+).

### ТБ1000

**8.10** Штучны інтэлект. Доступ неабмежаваны (16+).
**10.05** Прыстанак праклятых (16+).
**12.15** Хоць раз у жыцці (16+).
**14.15** Чалавек, які змяніў усё (16+).
**16.50** Паштальён (16+).
**20.10** Іншапланецянін (6+).
**22.25** Сэрцаед (16+).
**0.30** Матч-пойнт (16+).
**2.45** Аднакласнікі (16+).
**4.30** Таксі-4 (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Паляўнічы-3. Забойства дэпутата (16+).
**8.20** Поп (16+).
**10.50** Шык (12+).
**12.45** Труфальдзіна з Бергама. 2-я серыя(12+).
**14.20** Нябесны суд (16+).
**16.20, 4.20** Найлепшае лета нашага жыцця. 3—4-я серыі(16+).
**18.20** З Дона выдачы няма (16+).
**20.20** Дзень дурня (16+).
**22.15** Паляўнічы-4. Адплата (16+).
**0.25** Ушчэнт (16+).
**2.20** Паляўнічы-1. Чалавек з мінулага (16+).

### National Geographic

**6.00** Код небяспекі. (12+).
**6.25** Зрабі або памры. (12+).
**6.50** Займальная навука. (12+).
**7.35, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05** Шаша праз пекла. (12+).
**9.35** Служба бяспекі аэрапорта. (16+).
**11.55** Аўта-SOS. (12+).
**12.40** Антарктыка. (12+).
**13.25, 17.15, 20.15** Гульні розуму. (12+).
**15.45** Найгоршае надвор'е ў гісторыі? (16+).
**16.30, 19.30, 2.30** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 21.00, 1.00, 4.05** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны. (12+).
**18.45** Дзікае надвор'е. (12+).
**21.50** Выратаваць планету. (12+).
**23.25** Героі нябеснай вайны. (12+).
**0.10** Мяжа. (16+).
**1.45** Смага. (12+).
**4.50** Прарыў. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 2.25, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 1.00, 3.50** Сапёры. (16+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00, 18.00, 5.30** Хуткія і гучныя. (12+).
**14.00, 7.10** Голыя і напалоханыя. (16+).
**19.00, 0.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Браты Дызель. (16+).
**23.00** Паляўнічыя на рэліквіі. (16+).
**0.00** Як устроены Сусвет. (12+).
**1.30** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** «Боні: рускі рэкорд на саляным возеры». (12+).




## ДРЭС-КОД ПАНЯВОЛІ

Сярод людзей (а тым больш маладых), мусіць, няма такіх, хто не хацеў бы адзявацца прыгожа, зручна, модна. Шкада вось толькі, што яна, гэта мода, хутка мяняецца, што за ёй не паспяваеш нават сачыць, а ўжо адпавядаць...

У 50—60-я гады мінулага стагоддзя мы, хлопцы, фарсілі, помню, у «кляшах» (лінейкай мералі, у каго яны шырэйшыя). Што, дарэчы, зручна было, бо прыкрывала абутак, у некага — не вельмі новы, у некага — не вельмі чысты...

Потым на змену кляшам прыйшлі порткі-дудачкі. Каб надзець альбо зняць іх, патрабавалася часам дапамога сяброў ці некага з сямейнікаў.

Гэты ж строй дапаўнялі чаравікі-лыжы з доўгімі вузкімі насамі. А вось галаўныя ўборы тады наогул не прызнаваліся. У выніку ў маразы ды непагадзь сапраўдная пакута была: адмярзалі і вушы, і ногі. У клуб або з клуба хлопцы несліся подбегам, а калі даводзілася праводзіць дзяўчыну, — альбо разам з ёй «вытанцоўвалі», альбо лезлі цалавацца (так хоць трохі цяплей было).

Зрэшты, што тут казаць пра хлопцаў, калі ў погані за модай першымі былі не яны: іх, як заўжды, абганялі дзяўчаты.

...Гэтая чацвёрка маладых і прыгожых не сказаць, каб паміж сабой вельмі сябравала: проста працавала ў адной досыць паважанай установе і таму часцяком трымалася разам. Ва ўсякім разе, на розных нарадах ды пасяджэннях месцы займала побач — у першым радзе, перад самай трыбунай ды сталом прэзідыума (без іх тады ніякіх збораў не было)...

Выбару адзення, трэба сказаць, таксама: усе куплялі тое, што зрэдку з'яўлялася ў продажы, альбо даставалі недзе тканіну і шылі сабе на заказ.

Дык вось неяк усе чацвёра згаданых маладзіц (што цікава — кожная паасобку) прыкупілі па адрэзе вельмі моднага ў той час яркага з узорамі крымплену і пашылі сабе новыя сукенкі. Вядома ж, з улікам моды і ўласных густаў. У адной сукня атрымалася кароткая, з кароткім рукавом і какеткай, з накладнымі кішэнькамі, у другой — ужо даўгаватая, адразная па таліі і з пасачкам, у трэцяй (самай фігурыстай) — міні з глыбакаватым дэкальтэ, чацвёртай вельмі пасавалі каўнерык-стойка ды рукавы ліхтарыкам...

І вось неўзабаве склікаецца нейкі ўрачысты сход. Людзі пакрысе збіраюцца ў зале і, вядома ж, бачаць, як туды ў новай прыгожай сукенцы, у белых шпілечках, з акуратным начосам заходзіць Ніначка. Прыгажунька — нічога не скажаш — кожны з мужчын «правеў» яе позіркам ажно да першага рада і «пасадзіў» у крэсла.

Потым усе і гэтак жа дружна зноў павярнулі галовы да дзвярэй, бо яны адчыніліся і ў залу ўвайшла Наталля.

Не паспелі мы сцяміць, чым канкрэтна строі дзяўчат так падобныя, як у тым адрозныя, як у дзвярым праёме з'явілася Марына. Яе ў новай сукенцы з добра знаёмай тканіны людзі ўжо віталі не толькі ўсмешкамі, але і ціхім гулам — не то здзіўлення, не то адабрэння...

І ён не паспеў яшчэ толкам прыціхнуць, як «на гарызонце» зацокалі абцасікі чацвёртай модніцы ў сукенцы з крымплену. Яна пад дружныя апладысменты залы і завяршыла гэты «модны паказ».

...Дзяўчаты, як заўжды, сядзелі поруч, праўда, пачырванелыя — ад павышанай увагі, ад злосці ды крыўды на ўвесь свет, на сябе, сваіх швачак, сябровак... А тут яшчэ сакратар райкама «ў агонь бензіну падліў»: заняў сваё месца ў прэзідыуме, паглядзеў на дзяўчат у аднолькавых сукнях ды начальніку іх уголас сказаў:

— Малайчына ты... Здагадаўся, бач, для сваіх уніформу пашыць...

Аб чым ішла размова на тым сходзе, ніводная з дзяўчат не чула: кожная не магла дачакацца, каб гэтая «спеўка» як мага хутчэй завяршылася, каб пасля яе, па магчымасці паасобку, разбегчыся па дамах.

...Што яшчэ я дакладна ведаю, дык гэта тое, што ў сукенкі тыя яны прыбіраліся першы і апошні раз. Ніначка сваю адразу аддала малодшай сястры, Марына — занесла ў камісіёнку, Наталля некаму падарыла. І толькі Вольга трымае «абноўку» дагэтуль, каб можна было не толькі помніць самой, але і некаму расказаць (ды і паказаць яшчэ!), якія раней былі тканіны, якія фасоны і якія прыгоды з тым, што сёння называюць замежным словам «дрэс-код».

**Мікалай Ю.**

*Брэсцкая вобл.*

## УРОКІ ПРАФЕСАРА А.

Некалі ў нашым універсітэце гісторыю Беларусі выкладаў прафесар А. — высокі, мажны, з салідным барадой...

Прадмет свой ён ведаў, трэба разумець, бездакорна і такога ж ведання патрабаваў ад іншых. У выніку студэнтам, каб адказаць на пытанні білетаў, трэба было помніць проста безліч розных прозвішчаў, розных дат. Гэта магло ўратаваць іх ад дрэнных адзнак, ад перaздач, але ж не заўжды, бо на экзаменах у залiках усё роўна можна было «засыпацца»: гісторык вельмі любіў дадатковыя пытанні...

Ён жа вельмі не любіў, калі нехта сядзеў на падаконніку. А між тым яны ў галоўным корпусе БДУ былі шырокія, вабныя — так і падмывалі ўзабрацца.

Дык вось. Аднойчы дзве студэнткі філфака прыйшлі здаваць залік па гісторыі. Адна хуценька села на падаконне і разгарнула падручнік.

— Злезь, — загадала ёй другая, — а то зараз будзе ісці прафесар. Убачыць — мала не падасца.

— Не ўбачыць, — адмахнулася першая, — бо я тут жа саскочу.

Добра было так сказаць, а вось зрабіць... Выкладчык з'явіўся настолькі нечакана, што дзяўчына, якая сядзела на падаконніку, нават зварухнуцца не змагла — застыла на месцы.

— *Откуда ты, прелестное дитя?* — фразай з Пушкіна спытаў у яе прафесар.

— З трэцяга курса, з філфака, — заліўшыся чырванню, ледзь прамовіла Таня.

— Да мяне на залік прыйшлі?

— Да вас...

— Цудоўна. А на падаконніку сядзець непрыгожа, — прамовіў ён і пайшоў у свой кабінет. Студэнткі засталіся ў калідоры.

— Усё, зараз «зарэжа», — толькі што не плакала Таня. — Я залік яму ніколі не здам.

— Трэба паспрабаваць, — настойвала сяброўка, — іншага ж выйсця няма. А раптам пашчасціць?

...Як не сваімі нагамі «парушальніца парадку» ўваходзіла ў прафесарскі кабінет, цягнула білет.

Аднак на месцы змагла-такі неяк засяродзіцца, узяць сябе ў рукі: на пытанні білета адказвала добра. Не разгубілася і тады, калі прафесар спытаў, лёс якога партыйнага дзеяча пакладзены ў аснову фільма «Чырвонае лісце» ды якая рука ўзнятая ў Леніна на помніку каля Дома ўрада...

У выніку прафесару нічога не заставалася, як паставіць Тані залік, уручыць залікоўку ды нагадаць пра падаконнік.

Хоць мог і не нагадваць: Таня і так дзясятаму заказала.

**Раіса Хвір,**

*г. Нясвіж.*

## ІГРАЙ, МУЗЫКАНТ!

Глядзела неяк тэлеперадачу пра дзяцей-уцекачоў, і выплыла з памяці даўняе-даўняе, ды так яскрава...

Гэта быў мой першы працоўны водпуск. Я ехала дамоў з перасадкай у Оршы. Вакзал там — места бойкае, шумнае, народу шмат. Але ж вочы міжволі вярталіся да адной кампаніі. Гэта былі салдаты, якія, падобна, адслужылі недзе ў Польшчы ці Германіі (форма на ўсіх з іголачкі, чамаданы прыгожыя...). І сярод іх — дзіця, хлопчык гадкоў сямі ці васьмі: ён нешта цікавае расказваў салдатам, тыя — рагаталі...

Потым гэты рогат пачуў паставы — зрабіў колькі крокаў у бок кампаніі, і малога тады як ветрам садзьмула!

Мне здавалася — назусім, неяк шкада нават стала...

Але ж не: варта было паставому адысціся, як хлопчык з'явіўся зноў. «Ведае, шэльма, да каго прысуседзіцца, — падумала я. — Значыць, не паскупіліся вайскоўцы — прывецілі, нечым пачаставалі...»

Тым часам аб'явілі пасадку на цягнік да Ленінграда. Салдаты пайшлі да выхаду, малы падаўся за імі. А ў дзвярах зноў узнікла міліцыя: мальца за руку — і ў дзяжурку.

Я зноўку падумала, што больш не ўбачу яго. І зноў памылілася, бо высветлілася, што мы з ім селі ў адзін цягнік (хоць і ў розныя вагоны) і выйшлі таксама на адной і той жа станцыі. Праўда, па-рознаму: я самахоць, а хлопчыка, прычым моцна трымаючы за руку, вывеў міліцыянер і перадаў мужчыну (падобна — бацьку). Цяпер ужо той адной рукой трымаў дзіця, а другой — падпісваў нейкія паперы.

...Дома я, вядома ж, хацела расказаць пра гэту сустрэчу, але сястра адразу перапыніла, сказала:

— О, дык гэта ж зямлячок наш, Верабей! Яго бацькі на чыгунцы працуюць і жывуць каля самай станцыі. А яму на тых выселках сумна, відаць: сяброў няма, да вёскі далекавата. Вось ён і панадзіўся на цягніках катацца. То ў пасажырскі прашмыгне, то, калі не ўдасца, на таварным куды паедзе. Дзе толькі не лавілі яго!.. З маскоўскага цягніка неяк знялі. А цяпер, бач, на Ленінград намыліўся...

«Бяда ў людзей», — падумала я і, наступны раз едучы дамоў, ужо «шукала» вачыма таго Верабейка — у цягніку, на вакзале... Аднак хлопчыка нідзе не было.

— Можа, не ўцякае ўжо? — па прыездзе спытала ў сястры.

— Не, — засмяялася тая. — У яго бацькі цярпенне тады яшчэ лопнула: гэта ж ён колькі штрафаў сплаціў, колькі нерваў спаліў... Малога ў дзетдом хацелі забраць, каб не бадзяжнічаў... Дык бацька з ім, як са зброднілай каровай: купіў метраў дваццаць ланцуга, навязаў, а ў рукі даў гармонік... І што ты думаеш? За лета асвоіў, навучыўся іграць, ды так, што заслухаешся! Любую песню, любую мелодыю па радыё пачуе і ўраз падбярэ. Пры справе цяпер, дык чаго ўцякаць?

...Па сённяшнім часе бацьку за такія адносіны да дзіцяці, відаць, цягала б па першае чысло! Ды і тады... Негуманны ўчынак. Але ж добра ўсё, што добра канчаецца. Малы той, пэўна, жывы і здаровы яшчэ. Можа, дзе ў аркестры грае? Можа, кампазітарам стаў?

**Любоў Чыгрынава,**

*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

## ПРЫЁМНЫ ПАКОЙ



### Тры гадзіны, вартыя трох месяцаў

Нейкая восеньская мода сёлета ў сеціве пайшла — пісаць бальнічныя дзённікі. Трапляе чалавек, які мае нейкія публіцыстычныя здольнасці, на нескладаную аперацыю ці, скажам, нервы падлячыць, прабудзе тры тыдні або тры дні — і панеслася. Тут табе і Чэхаў, і Шэкспір, і дзядуля Фрэйд у адным флаконе. Не бальніца, а проста-такі тэатр чалавечых заган, дзівацтваў, разважанняў і ўчынкаў. І сярод гэтай дзеі сам аўтар — белы пушысты філосаф, які проста вымушаны цярпець усё, што адбываецца вакол, а каб трываць было лягчэй — піша нататкі, якія пасля ну проста абавязкова трэба выкласці ў віртуальнай прасторы на ўсеагульнае прачытанне і абмеркаванне.

Вось і падумалася: а чым я горшая? Праўда, досвед мой іншага кшталту — за даволі кароткі прамежак часу два разы давялося некалькі гадзін правесці ў прыёмным пакоі бальніцы хуткай дапамогі. Хтосьці скажа, што гэта зусім няшмат, але, калі ты ў ролі перапуханага сваяка, а на карэце «хуткай» прымчалі сюды тваго самага блізкага чалавека, — гэтыя тры гадзіны вартыя, пэўна, трох месяцаў, калі б ты ляжыўся сам. Прыёмны пакой — гэта не бальнічная палата: тут усё хутка, імкліва, тут агаленыя нервы і пачуцці, тут паўсюль чалавечы несупакоены яшчэ боль і гэткая самая чалавечая трывога. Тут ад сузірання навакольнай рэчаіснасці не становіцца лягчэй — яна наадварот рэзка б'е па вачах і вушах, па і без таго напружаных пачуццях. Хіба што разуменне таго, што не адзін ты тут такі, але гэта невялікае суцяшэнне.

Ужо на ганку прыёмнага пакоя сустрэлі першага пацыента. Мужчына стаяў, абапёршыся дзвюма рукамі аб машыну «хуткай» і хістаўся, як падалося, ад невыноснага болю. «Гэта яго проста выпусцілі трохі праветрыцца, — растлумачыла ўрач «хуткай». — Ён, глянце, які п'яны. Мы ж павінны ўсіх па выкліку забіраць, калі ёсць паказанні. У гэтага, можа, пячонка схапіла, можа, ціск паднялся. Вось і прывезлі...»

У прыёмным пакоі жаночага аддзялення — некалькі пажылых жанчын з аднолькавым выразам пакуты на тварах. На ўсіх — скокнуў ціск, схапіла сэрца. Кабет хутка аглядаюць, робяць неабходныя аналізы, тут жа, за шырмай, здымаюць кардыяграму. Рэагуюць яны па-рознаму: хтосьці спакойна тлумачыць доктару гісторыю сваёй хваробы, хтосьці абураецца, што менавіта ёй удзяляюць мала ўвагі, хоць медсястра ўжо звазіла яе на калясцы на ўсе аналізы і трэба крыху пачакаць рэзультатаў. Цётка нічога чуць не хоча, гучна выказвае прэтэнзіі (памятаеце, у Разэнбаума: «...голосит: «Я умираю! Вас дождешься — раньше в гроб уляжешься!»), калі ж урач пытае, што баліць, злосна адказвае: «Усё!» «У вас ціск ужо нармалізаваўся, але трэба паназіраць. Афармляем шпіталізацыю?» — «Я тут ні хвіліны не застануся!» Маладзенькія медсёстры толькі ўсміхаюцца: бабуля за пяць дзён тут ужо трэці раз. «Што ты хочаш, адзінокая, вось і выклікае «хуткую», як толькі прыцісне. Баіцца адна памерці, дый з людзьмі вось пабыла», — спагадліва гавораць адна адной.

Менавіта тут, у прыёмным пакоі, чалавечая адзінота відаць ва ўсёй сваёй страшнай сутнасці. Бабуля, якая чакае, пакуль яе забяруць у палату (дагэтуль яна тлумачыла медсястры: «У мяне, дзіцятка, усё з сабой патрэбнае для бальніцы сабранае, гэты пакет у шафе ўвесь час стаіць. Я ж адна жыву, няма каму пасля падвезці».), з такой зайздрасцю і тугой праводзіць вачыма сваю равесніцу, якую клапатліва, пастаянна перапытваючы «як ты, мама?» вязе на калясцы сівы ўжо сын, што, гледзячы на яе твар, хочацца ўкусіць кафельную сцяну.

Прывезлі яшчэ адну бабку з забінтаванай галавой, над ілбом расплываецца пляма крыві. Можа, спатыкнулася ці, крый божа, стала ахвярай сямейнага гвалту? Аказалася, цікаўная бабуля хацела дастаць нешта з высокай шафы навобмацак і скінула сабе на галаву цяжкую статуэтку. Бабулю павезлі ў траўматалогію, але дзяжурны ўрач, які яе аглядаў, супакойваe перапалохаую ўнучку: «Не хвалюйцеся, у яе ў горшым выпадку страсенне...»

Мужычок гадоў пад шэсцьдзясят з пабітым тварам і, хутчэй за ўсё, зламаным носам, не вельмі трывала стоячы на нагах і выдыхаючы смурод перагару, пасля «праветрывання» на ганку ўжо, можа, пяты раз блытае напрамак і заходзіць у прыёмны пакой для жанчын. «Тут жанчыны! Вам туды!» — на пяты раз крычым гэта ўжо хорам. Няўцямна патупаўшы, страсянуўшы галавой і мацюкнуўшыся, дзядзька кіруецца да выхада.

Чым бліжэй да ночы, тым часцей чуваць: «Санітары!» Гэта значыць, хуткая прывезла пацыента, які не можа рухацца сам, і патрэбныя насілкі. Усіх вязуць у мужчынскае аддзяленне, адтуль вельмі хутка — у траўматалогію. Пацярпелыя ў асноўным нецвярозыя. Малады хлопец, якога вязуць на каталцы, нацягвае на галаву прасціну, агаляючы пры гэтым белы жывот. «Што, сорамна, баішся, што на відэа ў Ютуб трапіш?» — ці то жартуе, ці то так падбадзёрвае небараку ўрач.

Увогуле, урачы прыёмных аддзяленняў — гэта людзі асаблівай вытрымкі. Захоўваць разважлівасць і добразычлівасць у такіх літаральна экстрэмальных умовах — гэта, я вам скажу, трэба ўмець. Так-так, добразычлівасць, я не памылілася. Намаляваны ў свядомасці многіх з нас вобраз цынічнага «канавала» ў мяне асабіста рассыпаўся ўшчэнт. Тут працуюць у асноўным маладыя хлопцы і дзяўчаты. Размаўляюць спакойна, слухаюць уважліва, дзейнічаюць хутка і ўпэўнена, кіруюца не толькі ведамі, але і інтуіцыяй. Нядаўна знаёмую такія вось хлопцы выратавалі ад немінучай пагібелі — на сваю рызыку прааперыравалі, без рэнтгену, бо кожная хвіліна магла каштаваць жыцця. А яшчэ ва ўсёй гэтай мітусні яны знаходзяць час і магчымасць сказаць разгубленым людзям, якія з чаканнем і надзеяй заглядаюць ім у вочы: «Не хвалюйцеся, у вас усё будзе добра»...

На гэтай аптымістычнай ноце дазвольце мой кароткі бальнічны дзённік скончыць. Можна было б, вядома, яшчэ паразважаць пра тое, што ў многіх сваіх праблемах са здароўем вінаватыя мы самі, і нават пра тое, як павысіць зарплату ўрачам — усё-ткі ажыццяўляць колішнюю ідэю спаганяць грошы за выклік «хуткай» да п'яных грамадзян. Але ў любым выпадку галоўным застанецца пажаданне і сабе, і ўсім добрым людзям: лепш ніколі тут не трапляць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | капитальное строение, инв. №413/С-18172 (назначение – здание специализированное розничной торговли 2 29 03, наименование – торговое здание «Универмаг» с подвалом), площадью 3870,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Свислочь, ул. Ленина, 23 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | кадастровый номер 425250100001001734, площадью 0,5356 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли 1 16 03), расположенном по адресу: г. Свислочь, ул. Ленина, 23 |
| **Начальная цена продажи** | 353 750 руб. (триста пятьдесят три тысячи семьсот пятьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 35 375 руб. (тридцать пять тысяч триста семьдесят пять рублей) |
| **Условия аукциона** | аукцион без условий |
| **Продавец** | Свислочский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231969, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 3-50-22 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 ноября 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» 11.07.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 22 ноября 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тираспольский агротехсервис» (УНП 300064100)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1 Капитальное строение (здание гаража), общей площадью 60,9 м$^2$, инв. №200/С-81840, начальная цена – 5760,00 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | г. Витебск, ул. Ленградская, 136И |
| Место, дата и время проведения торгов | 06.12.2017 г. в 12.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел/факс. (80212) 610424, (8033) 6879148 |
